**Л.М. Грыцук** (Брэст)

# РЭАЛІЗАЦЫЯ МАТЫВА НАЦЫЯНАЛЬНАГА АДРАДЖЭННЯ Ў ТВОРЧАСЦІ АЛЕСЯ ГАРУНА

Адраджэнне... Гэтае слова быццам песня гучала ў душы Алеся Гаруна. Адраджэнне павінна аднавіць пасля перыяду разбурэння нашу дзяржаву, незалежную дзяржаву. Яе незалежнасць бачылася паэту ў самастойнасці прыняцця рашэнняў, ажыццяўленні дзеянняў без абмежавання з чыйго-небудзь боку. Наша краіна павінна мець палітычную самастойнасць, суверэнітэт. Беларусь павінна зноў стаць жывым арганізмам, які імкнецца не выжываць, а жыць.

Імя Алеся Гаруна, выдатнага паэта, пачынальніка беларускай літаратуры XX стагоддзя, стаіць побач з імёнамі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага. Алесь Гарун – мастак трагічнага лёсу. У маладым узросце ён зведаў шмат гора, цяжкіх душэўных выпрабаванняў. Астрог, катарга, замененая на ссылку, былі складанымі часамі на яго кароткім жыццёвым шляху. Таму асабліва востра ў яго творчасці паўставала тэма барацьбы за свабоду і шчасце Радзімы.

Ацаніць мастацкую каштоўнасць твораў паэта Алеся Гаруна чытач змог амаль праз шэсцьдзесят год пасля смерці паэта. Творчасць Алеся Гаруна не вывучалі ні ў школе, ні ў ВНУ, творы былі выкраслены з гісторыі нашага народа. І здарылася такое «забыццё» згодна са сцвярджэннем, што паэт служыў радзіме і пад час акупацыі Беларусі. Аднак трэба заўважыць, што паэт і палітычны дзеяч Аляксандр Прушынскі заўсёды працаваў на карысць радзіме і яе народу пры любой уладзе. Па словах Т. Грамадчанка, «каб вярнуць з небыцця імя і спадчыну Алеся Гаруна, навуковай і творчай інтэлігенцыі ў 1980-я гг. даводзілася ісці нават на пэўную фальсіфікацыю грамадска-палітычнай дзейнасці і светапогляднай эвалюцыі пісьменніка. Усяляк падкрэсліваць прыхільнасць і лаяльнасць творцы да бальшавікоў» [2].

Творчасць Алеся Гаруна неадназначна ўспрымалася як яго сучаснікамі, так і крытыкамі пасля яго смерці. А.І. Барычэўскі ў 1928 годзе ў сваёй кнізе «Матчын дар» А. Гаруна» паспрабаваў даць аналіз зборніка паэта і як крытык даў яму высокую ацэнку [3]. А.І. Барычэўскі зрабіў першыя крокі ў плане вывучэння творчасці А. Гаруна, чым вельмі дапамог Літаратурнай Камісіі Інстытута Беларускай Культуры, якая ў той час пачала рыхтаваць акадэмічнае выданне твораў паэта. Аднак з 1929 года творчасць А. Гаруна трактуецца як вульгарна-сацыялагічная і амаль да 1945 года не выходзяць публікацыі, прысвечаныя творчасці паэта.

Станоўчыя водгукі на творчасць Алеся Гаруна давалі Я. Лёсік, Б. Тарашкевіч, Ц. Гартны, Я. Карскі, М. Гарэцкі. У. Казбярук вярнуў добрае імя паэту ў канцы 80-х гадоў XX стагоддзя.

Паэзія Алеся Гаруна глыбока дэмакратычная і гуманістычная. Яна прасякнута высокім грамадзянска-патрыятычным пафасам, непасрэдна звернута да народа, яго жыцця, гісторыі і сучаснасці. У вершах паэта моцна гучыць голас пратэсту супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, услаўляецца свабода народа, ідэя нацыянальнага адраджэння Бацькаўшчыны.

У перыяд грамадзянскай вайны Алесь Гарун часта друкуе мастацкія і публіцыстычныя творы ў розных перыядычных выданнях і калектыўных зборніках. Якія б перашкоды ні даводзілася пераадольваць, беларуская літаратура жыла, змагалася за права беларусаў народам звацца. І ў першых шэрагах барацьбітоў за лепшую долю ішоў Алесь Гарун з палымяным паэтычным радком і ўсхваляваным публіцыстычным словам. І гэта нягледзячы на хваробу і асабліва неспрыяльныя сямейныя і бытавыя абставіны.

У вершах паэта, напісаных у Сібіры, спалучаецца пакута і вера, споведзь і скарга выгнанніка, а таксама сведчанне нязломнай, непахіснай вытрымкі. Чытаем радкі вершаў, і адчуваем шчымлівае, неадольнае пачуццё духоўнай сувязі паэта з роднай зямлёй, з усім тым, што на ёй адбываецца. Паэт інтуітыўна прадчуваў перамены, якія наспяваюць, набіраюць сілы, з'яўляюцца вестунамі адраджэння дарагой сэрцу Беларусі:

Што мне жыццё, хоць бы самае краснае?
– Волі не маю! У няволі жыву.
Гэтае нуднае быцце уласнае
Смерцю страшэннаю з болем заву.
Сокалам вольным з пташынай гуллівасцю
Я бы, здаецца, адсюль паляцеў... («Думы ў чужыне»)

Вершы Алеся Гаруна – гэта песні-жальбы, яны наскрозь прасякнуты сумным настроем. Элегічны пачатак у вершах паходзіць ад суму, але гэты сум, гэтая пакута, гэты клопат поўнасцю датычыцца не толькі драмы ўласнага жыцця, а перш за ўсё таго, што паэт вельмі баяўся страціць духоўную повязь з Бацькаўшчынай. Яго душа гарыць пачуццём болю з нагоды ўсведамлення ўласнага бяссілля і безвыходнасці. Паэт ні на хвіліну не дапускае думкі пра тое, што мог бы шукаць у жыцці лепшага, больш спакойнага лёсу. Паэт звяртаецца да бацькі са словамі, якія сведчаць пра цяжкае жыццё і цяпер, і раней:

Салодкіх мала хваль, а горкіх натт багата
Памеў за жыцце ты, мой родны, бедны тата,
А можа, горкую табе і я хвілінку даў,
Не спагадаў
Табе калі... Цяпер за гэта выбачай. («На смерць»)

Галоўная тэма ўсёй творчасці Алеся Гаруна – Радзіма. Спрабуючы змагацца за яе свабоду і шчасце, ён бачыць сваё прызванне, галоўную мэту жыцця. Абвостранае пачуццё Радзімы, сыноўняй любові да яе, роздум аб яе гістарычнай долі праходзіць як лейтматыў праз усю

лірыку паэта. Вобраз Радзімы набывае шырокае абагульненае значэнне, асацыіруецца і зліваецца з вобразам маці. Маці-Радзіма для яго – самае дарагое, запаветнае, вышэйшы крытэрый любові, духоўнасці, маральнасці.

Большасць твораў Алесь Гарун напісаў у выгнанні, дзе, па сутнасці, склалася яго творчая індывідуальнасць, выявіўся шматгранны пісьменніцкі талент, прыйшла мастацкая сталасць. У многіх творах пераважаюць сумныя, элегічныя настроі, абумоўленыя трагедыяй жыцця выгнанніка, безвыходнасцю свайго паднявольнага становішча, адарванасцю ад бацькоўскай зямлі, беларускага моўнага асяроддзя. «Долі я не бачу, радасці не знаю» – гэтыя радкі з верша «Матчын дар» з'яўляюцца галоўнай тэмай песень-дум, песень-жальб «У выгнанні», «Журба», «Восень», «Навокал», «Думы ў чужыне». Але жорсткі лагерны рэжым не змог вытравіць у паэта бязмерную любоў да Бацькаўшчыны, веры ў свой народ, бо беларусы павінны жыць у свабоднай краіне:

Ты паўстанеш, працавіты,
Гаратнічы, невымоўны,
Шчасця, долі прагавіты,
Мой сланэчны, мой чароўны!
Будзе час, пабачаць сведкі,
Хоць не мы, дык нашы дзеткі. («Як надарыцца мінута...»)

Верш «Начныя думкі» з'яўляецца элегічна-ўсхваляваным успамінам паэта пра родны край, ад якога ён быў адарваны турэмнымі кратамі. У думках-снах лірычнага героя выказваецца любоў да Радзімы – казачна-міфічнага, «нязведанага» краю: да «стэпаў з-пад Нёмана», глухой пушчы, жытняга поля, векавечных курганоў, лясной крынічкі, рэчкі з русалкамі:

Хочацца быць мне ў тым краю нязнаным,
Хочацца край той абняць з прастаты,
Хочацца крыкнуць: гэй, краю каханы,
Будзь мне, як маці, будзь родным мне ты! («Начныя думкі»)

Адчуваючы вялікія кантрасты жыцця ў гэтым нязведаным краі (то злосна-хмурлівым, то светлым, як рай, поўным шчасця і адначасова жалю, плачу), лірычны герой твора хоча парваць жалезныя путы і адшукаць купальскую кветку, шлях-гасцінец да шчасця. Абвостранае пачуццё любові да Бацькаўшчыны, духоўная еднасць з роднай зямлёй, пратэст супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечання, заклік да барацьбы адчуваюцца ў вершах «Мілая, родная старонка-маці!..», «Навука», «Мае думкі», «Муляру». Адарванасць ад роднай зямлі не перашкаджала паэту з пашанай адносіцца да роднай мовы, заклікаць беларусаў берагчы яе, бо незалежнасць можна ўтрымліваць тады, калі жыве родная мова:

Дык шануй, беларус, сваю мову –

Гэта скарб нам на вечныя годы;
За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацця-народы!
(«Ты, мой брат, каго зваць беларусам...»)

Больш таго, паэт піша «Гімн роднай мове», у якім узносіць хвалу нашай мове, падкрэсліваючы, што яна не згінула:

Хвала табе! О, церпяліва,
За муку вечную тваю –
Дагэтуль ты ўсяму надзіва
Схавала моц вялікую...
Не згінула... («Гімн роднай мове»)

У вершы «Муляру» выразна гучыць заклік да муляра закончыць складаць каменныя сховы смерці і ісці будаваць іншы мур – новае жыццё. Створаны сілай і розумам многіх людзей, гэты мур будзе нагадваць палац са сценамі, як з крышталю, столлю, як са шкла. У гэтых паэтычных радках верша чуецца заклік паэта да чалавечага братства, роўнасці, свабоды:

Мур вялікі, вольнай волі,
Мур высокі да нябёс,
Мур братэрства, роўнай долі,
Мур для радасці без слёз... («Муляру»)

Многія вершы Алеся Гаруна – гэта лірычныя маналогі, вершы-разважанні, роздумы аб долі-нядолі народа з характэрнай палымянасцю, павышанай эмацыянальнасцю слова.

### *Спіс літаратуры*

1. Гарун, А. І я з народам...: вершы, апавяданні, п'еса / Алесь Гарун: уклад. і прадм. У. Казберука. – Мінск: Маст. літ., 2007. – 141 с.
2. Грамадчанка, Т. Радкі з любові народжаных слоў: лёс і творчыя набыткі А.Гаруна // Роднае слова, 2002, №3, с.7–11.
3. Барычэўскі, А.І. «Матчын дар» А. Гаруна / А.І. Барычэўскі. Мінск, 1928. – 19 с.